# У БЕЛАРУСІ ПАЧЫНАЮЦЬ ПРАКТЫЧНУЮ РЭАЛІЗАЦЫЮ ПРАЕКТА ПА СТВАРЭННЮ ПАРКУ ВЫСОКІХ ТЭХНАЛОГІЙ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даручыў неадкладна пачаць практычную рэалізацыю праекта па стварэнню Парку высокіх тэхналогій. Кіраўнік дзяржавы 25 кастрычніка наведаў месца, дзе размесціцца беларуская «сіліконавая даліна».**

Парк высокіх тэхналогій (ПВТ) размесціцца каля мікрараёна Уручча, паблізу асноўнай магістралі сталіцы, што вядзе да яе цэнтра, і за 30 мінут язды да міжнароднага аэрапорта.

Чакаецца, што Парк зойме плошчу 50 га, дзе размесцяцца навукова-даследчы корпус, будынкі прадстаўніцтваў фірмаў, цэнтр для правядзення канферэнцый, жылы і гасцінічны комплексы, гандлёвы цэнтр. Не выключана, што тут з'явяцца таксама жылыя дамы для тых, хто будзе працаваць у ПВТ. Асваенне тэрыторыі будзе весціся паэтапна.

Аляксандр Лукашэнка ў цэлым адобрыў задуму забудовы Парку высокіх тэхналогій. «Задума нядрэнная, забудова будзе глядзецца нядрэнна, але галоўнае, каб было нядорага», — падкрэсліў беларускі лідар.

Звяртаючыся да распрацоўшчыкаў праекта і службовых асоб, прэзідэнт адзначыў: «Рашэнне прынята, пачынайце з сённяшняга дня працаваць».

Кіраўнік дзяржавы лічыць неабходным ужо на пачатковым этапе арганізаваць работу з патэнцыяльнымі рэзідэнтамі Парку. «Жадаючыя ўжо ёсць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, «не будзе такога, што два гады будзем добраўпарадкоўваць Парк, а потым усіх запросім сюды». Жадаючыя стаць рэзідэнтамі ПВТ могуць укладваць сродкі ўжо цяпер.

Адзначыўшы, што рэзідэнтам Парку будуць прадастаўлены каласальныя магчымасці, прэзідэнт указаў на важнасць распрацоўкі неабходных дакументаў.

Як паведаміў старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Міхаіл Мясніковіч, прапановы па Статуту Парку высокіх тэхналогій будуць унесены ў Савет Міністраў на будучым тыдні.

Кіраўнік НАН падкрэсліў, што беларускія праграмісты паспяхова канкурыруюць на сусветных рынках з вядучымі вытворцамі праграмнага забеспячэння. Асваенне тэрыторыі Парку плануецца ажыццявіць за бліжэйшыя 2-3 гады. Міхаіл Мясніковіч падкрэсліў, што льготы для рэзідэнтаў Парку высокіх тэхналогій не будуць уступаць тым, што прадастаўляюцца ў Расіі. Яны нават будуць вышэйшыя, чым у Індыі і іншых дзяржавах, якія займаюцца афшорным праграміраваннем.

Дырэктар адміністрацыі Парку Валерый Цапкала паведаміў, што цяпер зацвярджаюцца формы бізнэс-плана, заяўкі і дагаворы. «Ужо на першых этапах функцыянавання ПВТ мы чакаем істотны рост экспарту праграмнага забеспячэння і больш актыўнага выкарыстання яго айчыннымі прадпрыемствамі і дзяржустановамі», — сказаў ён.

У бліжэйшы час плануецца падрыхтаваць праект дэталёвай планіроўкі і размяшчэння аб'ектаў Парку. Пасля гэтага будуць вызначаны ўчасткі, што аддаюцца пад забудову.

На думку прэзідэнта, месца для стварэння Парку выбрана аптымальна. «Калі задуманае мы ажыццявім, развіццё будзе каласальнае», — перакананы беларускі лідэр.

Галоўны архітэктар Мінска Руслан Белагорцаў паведаміў, што пры будаўніцтве інфраструктуры Парку высокіх тэхналогій будуць прымяняцца цікавыя і ў многім унікальныя горадабудаўнічыя рашэнні.

Аляксандр Лукашэнка агледзеў прылеглыя тэрыторыі і даручыў задзейнічаць усе пустыя будынкі на месцы стварэння ПВТ. «Іх трэба выкарыстаць з карысцю для справы», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

***(Заканчэнне на 2-й стар.)***

# У БЕЛАРУСІ ПАЧЫНАЮЦЬ ПРАКТЫЧНУЮ РЭАЛІЗАЦЫЮ ПРАЕКТА ПА СТВАРЭННЮ ПАРКУ ВЫСОКІХ ТЭХНАЛОГІЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У гэты ж дзень прэзідэнт наведаў будаўніцтва новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі. Прыезд Аляксандра Лукашэнкі да месца ўзвядзення галоўнай інтэлектуальнай скарбніцы краіны не быў запланаваны загадзя. Беларускі лідар азнаёміўся з ходам работ і выкананнем дадзеных даручэнняў адносна гэтага важнага сацыяльна-культурнага аб'екта.

Прэзідэнт неаднаразова гаварыў аб важнасці выканання будаўнічых работ на самым высокім узроўні, узвядзенне бібліятэкі знаходзіцца непасрэдна пад кантролем кіраўніка дзяржавы.

Агледзеўшы хол, чытальную залу, залу для нарад, адміністрацыйныя і іншыя памяшканні, Аляксандр Лукашэнка рэзка крытыкаваў будаўнікоў за якасць работ. Нават беглы агляд даў магчымасць выявіць наяўнасць шэрагу недахопаў пры будаўніцтве і аддзелцы памяшканняў. Іх, паводле слоў прэзідэнта, належыць ліквідаваць у бліжэйшы час. Як падкрэсліў беларускі лідар, з-за такіх дробязяў церпіць імідж будынка ў цэлым.

Крытычныя заўвагі адносна якасці будаўнічых работ былі выказаны ў адрас прэм'ер-міністра, мэра сталіцы і яго намесніка, а таксама непасрэдна кіраўніцтва будоўлі. Міністру культуры было ўказана на неабходнасць больш прынцыповага падыходу пры прыёмцы памяшканняў.

«Апошні раз папярэджваю: за гэты аб'ект я ні сантыметра недаробак нікому не дарую. Не дай Бог што-небудзь будзе не так, і я ўбачу, што хоць адзін рабочы схалтурыў, вінаватыя будуць несці адказнасць. Усё, у тым ліку аддзелка, павінна быць ідэальна. Новы будынак бібліятэкі — узор найвышэйшай культуры, і ўсё тут павінна быць выканана на самым высокім узроўні», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў: усе адміністрацыйныя памяшканні ў новай бібліятэцы павінны быць прадуманымі і функцыянальнымі. «Зрабіце так, каб усё працавала на чалавека, наведвальніка бібліятэкі, а не на чыноўніка», — дадаў ён. Сродкі пры абсталяванні памяшканняў павінны быць укладзены так, каб забяспечыць максімальны камфорт і зручнасць для чытачоў.

Прэзідэнт запатрабаваў не зніжаць інтэнсіўнасці работ па ўзвядзенню новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі. Аднак гэта не павінна рабіцца ва ўрон якасці. «Трэба спяшацца, але рабіць усё з розумам і ў адпаведнасці з тэхналогіямі. Калі пасля завяршэння будаўніцтва мне далажаць, што штосьці працякло, правісла — будзеце несці адказнасць. Пры здачы аб'екта будзе праверваны кожны квадратны сантыметр», — заявіў беларускі лідар.

Як было далажана прэзідэнту, у снежні будаўнічыя работы павінны быць завершаны. Цяпер на будаўнічай пляцоўцы бібліятэкі заняты 1200 чалавек.

Аляксандр Лукашэнка даручыў у бліжэйшы час завяршыць добраўпарадкаванне прылеглых да бібліятэкі тэрыторый.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**